# М. ТАНК – ЗАГАДЧЫК ЛІТАРАТУРНАГА АДДЗЕЛА ГАЗЕТЫ «НАША ВОЛЯ» (Вільня, 1935–1936 гг.)

***П. Л. Дарашчонак***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*pdoroshhyonok@mail.ru*

У публікацыі разгледжаны артыкулы, паэтычныя творы М. Танка, вядучых аўтараў заходнебеларускай газеты «Наша воля» (1935–1936 гг.)

***Ключавыя словы:*** газета; публіцыстычная творчасць; заходнебеларуская літаратура; кансалідацыя нацыянальных сіл.

# M. TANK – HEAD OF THE LITERARY DEPARTMENT OF THE NEWSPAPER «NASHA VOLYA» (Vilna, 1935–1936)

***P. L. Doroshchenok***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: P. L. Doroshchenok (pdoroshhyonok@mail.ru)*

The publication examines the articles and poetic works of M. Tank, the leading authors of the Western Belarusian newspaper «Nasha Volya» (1935–1936).

***Key words:*** newspaper; journalistic creativity; Western Belarusian literature; consolidation of national forces.

У снежні 2020 г. споўнілася 85 гадоў з дня выхаду заходнебеларускай газеты «Наша воля» – друкаванага органа КПЗБ, у працы якой прымаў актыўны ўдзел малады паэт і публіцыст Яўген Скурко (Максім Танк). Магутны рэвалюцыйны напал, з якім 23-гадовы паэт распачынаў у сярэдзіне 30-х гг. новы этап сваёй літаратурнай і публіцыстычнай творчасці, супаў па часе з утварэннем антыфашысцкага Народнага фронту, які аб'яднаў барацьбітоў за дэмакратычныя свабоды, за школу на роднай мове і вырашэнне сацыяльна-эканамічных праблем. Гэта быў час, калі прагрэсіўная заходнебеларуская літаратура атрымала магчымасць актыўна ўплываць на думкі і памкненні моладзі. Апрача Максіма Танка ў шэрагах Народнага фронту дзейнічалі Міхась Васілёк,

паэты Мікола Засім, Алесь Рэдзька (Дубровіч), Анатоль Іверс (Іван Міско), Ніна Тарас, Ганна Новік, Пятрусь Граніт і інш. Напрыканцы 1935 г. дзеячы рэвалюцыйнай заходнебеларускай літаратуры атрымалі магчымасць выдаваць сваю газету.

Першы нумар «Нашай волі» з падзагалоўкам «Беларускі незалежны двухтыднёвы часопіс» выйшаў 24 снежня 1935 г. Ідэйнае кіраўніцтва газетай ажыццяўляла КПЗБ праз сваіх прадстаўнікоў. Гэта былі інструктары ЦК Самуіл Малько і Максім Танк. Першы вёў палітыка-публіцыстычны аддзел, другі – літаратурны [1, с. 153–154]. Адказным рэдактарам і выдаўцом газеты стаў Вінцэсь Склубоўскі. Ураджэнец Ашмянскага павета Віленскай губерні быў выхаванцам Беларускай гімназіі ў Вільні, пасля вучыўся ва Універсітэце Стэфана Баторыя. Вядомы дзеяч беларускага руху Заходняй Беларусі з’яўляўся членам Таварыства беларускай школы, часта сустракаўся з Рыгорам Шырмам, Максімам Танкам, Янкам Хворастам.

Газета «Наша воля» адразу стала палітычнай і літаратурнай трыбунай для прагрэсіўных пісьменнікаў. У першым нумары рэдакцыя звярталася да чытачоў: «Адчуваючы балючую патрэбу беларускай прэсы, група беларускай незалежнай інтэлігенцыі прыступіла да выдання «Нашае волі». Мы верым, што нашыя пачынанні, да якіх мы доўгі час рыхтаваліся, знойдуць прыхільнае спатканне сярод беларускага грамадзянства.

Дзеля гэтага просім матэрыяльнага і маральнага падтрымання з боку вёскі і горада. Рэгулюючы передаплату, збіраючы ахвяры, пашыраючы газэту і прысылаючы весткі аб жыцці сялян, работнікаў, моладзі і нашай інтэлігенцыі, кожны спаўняе свой грамадскі абавязак у адносінах да часопісу.

Заклікаючы ўсіх да супрацоўніцтва, хочам верыць, што «НАША ВОЛЯ» з бегам часу стане воляй Беларускага Народу» [2].

Газета выдавалася фарматам А-3 на 4-х, часам 6-ці старонках. З першых нумароў у выданні існавалі пастаянныя рубрыкі: «З усяго свету», «Міжнародны агляд», «З Польшчы», «Карэспандэнцыі», «З беларускага жыцця», «Паштовая скрынка», «З жыцця вёскі» і інш. Адрас рэдакцыі быў змешчаны ў шпігелі, побач з загалоўкам: г. Вільня, Татарская вул. 15-1. Гадавая падпісная плата складала 3 злотыя, кошт аднаго нумара – 15–20 грошай.

Традыцыйна нумар газеты адкрываўся перадавымі артыкуламі рэдактара В. Склубовіча на актуальную тэму. Артыкул «Наперад» (НВ, 1935, № 1) быў прысвечаны нацыянальнай інтэлігенцыі, складовай часткай якой з’ўлялася студэнцкая і вучнёўская моладзь: «На нас, маладых, ляжыць вялікая адказнасць за лепшае заўтра. Найбольшы яе

цяжар спачывае на той частцы моладзі, каторая мае магчымасць расшырыць кругазоры свайго светапагляду праз чэрпанне агульналюдзкіх скарбаў веды» [3].

Газета пастаянна друкавала матэрыялы аб узрослай пагрозе фашызму для краін Еўропы і свету, асвятляла барацьбу прагрэсіўных сіл супраць гэтай пагрозы. На старонках выдання змяшчаліся публікацыі аб захопніцкіх планах італьянскага дыктатара Мусаліні: «Што трэба ведаць пра Абісынію», «З фронту афрыканскае вайны», «Спроба Ляваля ліквідаваць вайну» (НВ, 1935, № 1); ваенных аперацыях мілітарысцкай Японіі ў Паўночным Кітаі – «На Далёкім Усходзе» (НВ, 1936, № 1) і іншых узброеных канфліктах.

Наладзіўшы сувязь з масамі, карэспандэнтамі на месцах, рэдакцыя шмат пісала аб барацьбе працоўных Заходняй Беларусі за Народны фронт, вяла палеміку з ідэолагамі польскай і беларускай буржуазіі. Так, на старонках «Нашай волі» разгарнуў вострую палеміку з буржуазнымі нацыяналістамі Рыгор Раманавіч Шырма. Ен выступіў супраць ідэолага польскіх абшарнікаў Мацкевіча-Цата, які ў сваёй газеце «Slowo» абазваў Талстога «забойцам вялікага народа і вялікай дзяржавы». У артыкуле «Святло і цемра» (НВ, 1935, № 1) Р. Шырма пісаў, што «рана чытаць атходную літанію расійскай нацыі, Яна жыве. Жыве таму, што магла даць свету такога Талстога». Калі ж за Мацкевіча ўступілася беларуская нацыяналістычная газета «Родны край», «Наша воля» дала і ёй належны адказ у публікацыі «Шукаюць аблічча» (НВ, 1935, № 2): «З беларускім заалагічным нацыяналізмам, які прышчэплівае нашаму народу нянавісць у адносінах да суседніх народаў, будзем бароцца, як з кожным іншым».

Працуючы ва ўмовах падполля, знаходзячыся на нелегальным становішчы, аўтары газеты не заўсёды мелі магчымасць надрукаваць свае матэрыялы пад уласнымі прозвішчамі. Рэдактар нярэдка ставіў пад перадавым артыкулам крыптонім *В. С-і.* Свае артыкулы Р. Шырма падпісваў крыптонімам *В. М.* Няштатныя аўтары змяшчалі свае допісы пад псеўданімамі: *Іскра*, *М. Падлесны*, *М. Званар*, *Сумны, Чаромха* і г. д. У дзённікавых запісах «Лісткі календара» М. Танк пісаў аб рэдакцыйным актыве газеты «Наша воля»: «У мяне ў самога было некалькі клічак і псеўданімаў (Максім Танк, Аўгень Бура, А. Граніт – *П. Д.)*. Толькі пасля ўз’яднання Беларусі я даведаўся аб сапраўдных імёнах і прозвішчах такіх кіруючых работнікаў кампартыі, як Паўлік – Самуіл Малько (генерал польскай арміі), Гарасім – М. Дворнікаў (былы сакратар ЦК камсамола Заходняй Беларусі, гераічна загінуў у Іспаніі ў 1937 г.), Трахім – Буткевіч, Рэга – Л. Янкоўская, Кастусь – М. Крыштафовіч» [4].

Кожны месяц «Наша воля» прыносіла чытачам новыя вершы і празаічныя творы М. Танка. У № 4 (5) былі змешчаны вершы «Два», «Пад вастрожнай сцяной», «Байка пра Кліма», нарыс «Там, дзе вазёры». У наступным № 5 (6) газеты ад 20 сакавіка 1936 г. М. Танк надрукаваў нарыс «Поперак загонаў», верш «Спатканне». Тут жа, у артыкуле «Вечар беларускай паэзіі і песні», змяшчаўся водгук аб творчасці паэта: «Першую і вялікую славу пражыў Максім Танк. Танк заслужыў у поўнасці таго, што ён пражыў у гэты вечар. Максім Танк – гэта вельмі маладая, але сільная творчасцяю індывідуальнасць. Ягоная творчасць вырасла ў вастрогах і, вырваўшыся з турмы, заліла Зах. Беларусь. Творы Танка – гэта лавіна, якая парывае ўсіх, трасе ўсім і ламае ўсё. Танк можа стацца вялікім песняром Беларусі, калі не забудзе аб найважнейшай умове – згушчаць чым найбольш думку на палатне вобразу. Творы Танка «Першы акт» і «Спатканне» – гэта хваля свежага паветра ў беларускай паэзіі» [5].

У наступным нумары аўтар, які падпісаўся крыптонімам *С. Г.*, яшчэ больш узнёсла ахарактарызаваў вершы паэта: «Трэба прызнацца, што найглыбейшае ўражанне зрабіў на мяне Танк. Ягоныя вершы, поўныя глыбокага рэалізму і духовай бадзёрасці, пазваляюць верыць, што пры памысных варунках Танк праз нейкі час стане наймагутнейшым і найболей папулярным паэтам Беларусі» [6].

Газета «Наша воля» выдавалася з 24 снежня 1935 г. да 23 жніўня 1936 г., усяго выйшла 13 нумароў. Асобныя нумары ўлады забаранялі даваць у продаж, некаторыя выдаваліся з «белымі плямамі». Больш паловы матэрыялаў на першай і другой старонках у № 11 (12) ад 4 жніўня 1936 г. былі зняты цэнзарам (перадавы артыкул «Супольнымі сіламі да супольнай мэты», артыкул «Мы за абарону міру», інфармацыя «Як ідзе школьная справа», верш М. Танка). За час выхаду газеты на яе старонках былі апублікаваны апавяданне М. Танка «На прадмесьці» (НВ, 1936, № 3), яго крытычныя артыкулы аб паэзіі М. Машары «"Падарожжа" і "бездарожжа"» (НВ, 1936, № 6), «Досыць бездарожжа» (НВ, 1936, № 8). М. Танк пераклаў на беларускую мову знакамітыя творы М. Горкага: «Песня аб Буравесніку» (НВ, 1936, № 10), «Песня аб Сокале» (НВ, 1936, № 11). Шырокі рэзананс у чытачоў выклікала публікацыя М. Танка «На новы шлях» (НВ, 1936, № 12) аб патрэбе арганізацыі Саюза беларускіх пісьменнікаў. У гэтым жа нумары быў надрукаваны матэрыял М. Танка «Па Наваградчыне», напісаны сакавітай беларускай мовай у жанры падарожнага нарыса.

У сярэдзіне 30-х гг. ХХ ст. імя М. Танка набыло шырокую вядомасць у Заходняй Беларусі, яго творы друкаваліся ў газетах «Наша воля», «Ма-

ладая Беларусь», «Летапіс», «Калоссе», «Шлях моладзі». Р. Шырма ў публікацыі «Уражанні з “культурнай крытыкі”» падводзіў першыя вынікі ўзыходжання М. Танка да вышынь паэтычнага майстэрства: «праўдзівы і глыбокі талент найчасцей спатыкае і заслужана прыхільную ацэнку, аднначасна і злосную варожасць». У прыватнасці, рэдакцыя газеты «Шлях моладзі» назвала крытыку твораў М. Машары ў артыкуле М. Танка «Досыць бездарожжа» праяўленнем «злосці, зайздрасці ды някультурнасці». Аўтар, падкрэсліваючы безумоўную слушнасць грамадзянскай пазіцыі М. Танка, адзначаў, што «паэт заўсёды павінен мець чуткасць да ўсякай грамадскай несправядлівасці, створанай сільнымі процiў слабых» [7].

М. Танк у публікацыях на старонках газеты «Наша воля» і іншых нацыянальных выданняў, а таксама ў выдатных паэтычных творах 30-х гг. імкнуўся да ўсебаковага адлюстравання народнага жыцця, раскрыцця талентаў і здольнасцяў лепшых прадстаўнікоў беларускага народа. Праз кансалідацыю ўсіх творчых сіл – пісьменнікаў, паэтаў, літаратараў, публіцыстаў – паэт пракладваў шляхі да стварэння незалежнай беларускай прэсы, скіраванай на будаўніцтва лепшай будучыні.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Гісторыя беларускай савецкай літаратуры ў двух тамах. Т. 1. 1917–1941 гг. Мінск, 1965. 633 с.
2. Ад рэдакцыі // Наша воля. 1935. № 1. 24 снеж.
3. *В. С-і.* Наперад // Наша воля. 1935. № 1. 24 снеж.
4. Родныя вобразы / М. Танк. «Лісткі календара». [Электронны рэсурс]. URL: http://rv-blr.com/literature/charter/ 24412 (дата звароту: 06.01.2021 г.).
5. Вечар беларускай паэзіі і песні // Наша воля. 1936. № 5(6). 20 сак.
6. *С. Г.* З «вечара беларускай паэзіі і песні» // Наша воля. 1936. № 6 (7). 12 крас.
7. *В-ІЧ.* Уражанні з «культурнай крытыкі» // Наша воля. 1936. № 12. 23 жн.